ПАДЗЕЯ

# ПАКЛІКАННЕ З ВЕЧНАСЦІ

**17 лютага 2023 года Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага прымала адмысловае літаратурнае мерапрыемства. У прысутнасці вялікай колькасці аматараў літаратуры рознага ўзросту тут адбылася прэзентацыя кнігі «Песнярам Айчыны» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2022), зборніка твораў-прысвячэнняў сучасных пісьменнікаў Гродзеншчыны вобразам класікаў беларускай літаратуры.**



Нам часта даводзіцца чуць шмат мудрых і правільных слоў аб працягу традыцый у айчынным мастацтве, аб пераемнасці пакаленняў, аб захаванні гістарычнай памяці. Усё гэта дасягаецца добрымі справамі, сумленнай працай. Выхад дадзенай кнігі, адзін са шляхоў духоўнага яднання з вобразамі нашых слаўных продкаў – доказ таму. Літаратуры, кнізе, нездарма названай Ф. Скарынам «крыніцай мудрасці, ведаў і навукі, лекамі для душы», падуладна пачуць і падхапіць гэтае сімвалічнае пакліканне з вечнасці.

У літаратурна-музычнай вечарыне з нагоды прэзентацыі праекта Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, кнігі «Песнярам Айчыны» прынялі ўдзел старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч; кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы А. Э. Сабуць – адпаведна ўкладальнік і рэдактар зборніка, а таксама: член СПБ, беларуская паэтэса Ірына Войтка (Слонім); педагог, паэтэса Ірына Ганісеўская (Слонім); кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая; член СПБ, паэт Браніслаў Ермашкевіч (Гродна); член СПБ, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён); член Гродзенскага гарадскога літаб’яднання «Надзея», паэтэса Людміла Мілоста; член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык; член СПБ, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая; беларускі празаік Ірына Салата; член СПБ, паэтэса Людміла Шаўчэнка (усе – з Гродна). Вельмі важна, што гродзенскі дыялог з вобразамі класікаў

падтрымала зацікаўленая моладзь. Гэта пераканаўчы, аргументаваны адказ усім скептыкам. У зборніку «Песнярам Айчыны» і ў яго прэзентацыі паўдзельнічалі студэнты філалагічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы (спецыяльнасць «беларуская філалогія») Кацярына Гудзіновіч, Дар'я Дзяшук, Вольга Навіцкая, Вераніка Саўко, Дар'я Шабельская, Ангеліна Янкелайць і Ксенія Урбановіч. У выкананні аўтараў прагучалі вершы, эсэ, малая проза. Мова зборніка – беларуская.

З музычнымі падарункамі для ўсіх, хто ў гэты дзень прыйшоў дакрануцца да роднага мастацкага слова, выступілі маладыя спявачкі Карына Харытонік і Вікторыя Іванова (Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў).




У пачатку і ў фінале мерапрыемства Людміла Антонаўна Кебіч агучыла ўрыўкі з уласнага артыкула «Купалавы традыцыі ў творчасці сучасных паэтаў Гродзеншчыны» – прадмовы да кнігі. Дарэчы, прадмоў у кнізе тры. Акрамя Л. А. Кебіч, іх аўтарамі сталі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы беларускі краязнавец, публіцыст Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч («Натхненне традыцый») і педагог, навукоўца Аліна Эдмундаўна Сабуць (артыкул ««Мілая, слаўная моладзь»: у вянок класікам» – прадмова да моладзевага раздзела кнігі). Аліна Эдмундаўна па чарзе прадставіла студэнтаў і ўжо сваіх маладых калег – па зборніку «Песнярам Айчыны». Атмасфера прэзентацыі адрознівалася нейкай невытлумачальнай таямнічасцю і запомніцца ўсім нам надоўга. Падчас выступленняў у фае бібліятэкі стаяла ідэальная цішыня, якую парушалі толькі гучныя апладысменты. Здавалася, што нас уважліва слухаюць не толькі сучаснікі-землякі, але і душы класікаў. Напрыканцы мерапрыемства асобнікі кнігі атрымалі Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага, Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка і Музей Максіма Багдановіча. Удзельнікі праекта атрымалі ў свой адрас шчырыя словы падзякі за зробленую справу.

Прэзентацыя зборніка твораў-прысвячэнняў пісьменнікаў Гродзеншчыны класікам беларускай літаратуры «Песнярам Айчыны» стала адным з цэлага шэрагу мерапрыемстваў у Гродне і Гродзенскай вобласці, прымеркаваных да Міжнароднага дня роднай мовы. Прэзентацыі кнігі таксама плануюцца ў іншых установах культуры і адукацыі Прынёмання, ва ўстановах культуры горада Мінска, на пляцоўках XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу і Дня беларускага пісьменства ў Гарадку (Віцебская вобласць).

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** падчас прэзентацыі зборніка твораў-прысвячэнняў пісьменнікаў Гродзеншчыны класікам беларускай літаратуры «Песнярам Айчыны». ГАНБ імя Я. Карскага, 17 лютага 2023 года.



Ірына Войтка




Новае імя: Ірына Ганісеўская




Святлана Глембоцкая



Браніслаў Ермашкевіч



Мікалай Іваноўскі



Людміла Мілоста



Спявае Карына Харытонік



Дзмітрый Радзівончык



Аліна Сабуць




Ганна Скаржынская-Савіцкая




Ірына Салата



Людміла Шаўчэнка





Спявае Вікторыя Іванова







А. Э. Сабуць са студэнтамі-філолагамі, калегамі па зборніку «Песнярам Айчыны»




Словы падзякі аўтарам зборніка ад прадстаўніка чытацкай аўдыторыі





Асобнік кнігі ўручаецца прадстаўніку Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А. Макаёнка




Асобнік кнігі «Песнярам Айчыны» ўручаецца прадстаўніку Музея Максіма Багдановіча ў Гродне. Ад калектыву музея – салодкі падарунак пісьменнікам




Некалькі асобнікаў зборніка трапляюць у фонд Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага (атрымлівае дырэктар дзяржаўнай установы культуры Марына Эдвардаўна Ігнатовіч)


2023
созидания
ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ


ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ





***Фота*** Анатоля Апанасевіча